# Проста памятаць – недастаткова

## Чаму немцы не хочуць забываць страшныя старонкі свайго мінулага?

**Такое паняцце, як «культура памяці», за апошнія два-тры дзесяцігоддзі трывала ўвайшло не толькі ў лексікон, але і ў духоўны побыт жыхароў Германіі. І гэта нягледзячы на тое, што звычайна яно ўключае ў сябе асэнсаванне германскіх падзей перыяду нацыянал-сацыялізму, Халакосту і наогул асэнсаванне жаху ўсіх тых злачынстваў, якія чынілі фашысты ў адносінах да мірнага насельніцтва ў час Другой сусветнай вайны, а таксама іх маштабаў і вынікаў. Як ні парадаксальна, але сучасныя немцы не хочуць забываць гэтыя не зусім прыемныя для іх старонкі мінулага сваёй краіны.**

Больш за тыдзень доўжылася адукацыйная паездка ў Берлін, арганізаваная Школай журналістыкі Мінскага міжнароднага цэнтра імя Ё. Рау пры падтрымцы Міністэрства замежных спраў ФРГ для прадстаўнікоў беларускіх СМІ. За гэты час у нас было мноства разнастайных сустрэч. Арганізатары прапанавалі нам паглядзець, як у сучаснай Германіі фарміруецца культура памяці, як выхоўваюць маладое пакаленне ў духу павагі да гісторыі, як вучаць разумець трагічныя яе старонкі, даводзяць неабходнасць захавання і зберажэння памятных мясцін. Мы наведалі мемарыяльныя комплексы, музеі і месцы, звязаныя з зараджэннем нацызму і вынікамі Другой сусветнай вайны. І кожнае такое знаёмства давала нямала падстаў для роздуму, аналізу і адначасова – захаплення зробленым у краіне… пераможаных.

### Радасць і сум Карлсхорста

У колішні прыгарад германскай сталіцы Карлсхорст, а цяпер – адзін з раёнаў, якія ўваходзяць у берлінскую адміністрацыйную акругу Ліхтэнберг, мы прыехалі на гарадскім маршрутным аўтобусе. Толькі паспелі на патрэбным нам прыпынку пакінуць салон, як у яго заскочыла група юркіх і гаманлівых школьнікаў. Наш куратар доктар Эдзіт Шпільхаген тут жа патлумачыла, што гэтыя дзеці вяртаюцца з экскурсіі ў музей, наведаць які запланавалі і мы.

А музей гэты ва ўсіх адносінах – арыгінальны. Па-першае, знаходзіцца ў будынку, у якім 8 мая ў 22 гадзіны 43 мінуты па цэнтральнаеўрапейскім часе, а па маскоўскім – у 0 гадзін 43 мінуты ўжо 9 мая быў падпісаны акт аб безагаворачнай капітуляцыі германскіх узброеных сіл, што абвясціў аб заканчэнні Вялікай Айчыннай вайны для СССР і Другой сусветнай вайны для Еўропы. Па-другое, ён з'яўляецца адзінай у Берліне музейнай установай, куратарства над дзейнасцю якой ажыццяўляюць адразу дзве дзяржавы – Федэратыўная Рэспубліка Германія і Расійская Федэрацыя. Праўда, апошняя, як пераемніца Савецкага Саюза, дзеліцца ў гэтай справе пэўнымі паўнамоцтвамі яшчэ і з Беларуссю і Украінай. Менавіта таму на флагштоках перад будынкам музея лунаюць сцягі чатырох краін. Але, нягледзячы на гэта, установа мае афіцыйную назву Германа-Расійскі музей «Берлін-Карлсхорст».

– Па вялікім рахунку, наш музей – гістарычны помнік, – на добрай рускай мове тлумачыць навуковы супрацоўнік установы немка Інгрыд Дамераў. – Яго экспазіцыя ўнікальная ўжо тым, што максімальна блізка да рэальнасці перадае атмасферу пераможнага майскага дня ў далёкім 1945 годзе.

Далей фрау Інгрыд падрабязна расказвае пра асаблівасці таго гістарычнага моманту. Праўда, не забывае згадаць, што цырымонія ў Карлсхорсце была не першай па ліку, і гэта многіх з нас здзіўляе. Справа ў тым, што акт аб капітуляцыі Германіі быў падпісаны 7 мая ў французскім горадзе Рэймс. Свае подпісы пад ім паставілі прадстаўнікі саюзных войскаў, а ад пераможанай Германіі – начальнік штаба аператыўнага кіраўніцтва Вярхоўнага камандавання генерал-палкоўнік А. Іодль. Ад СССР на той цырымоніі быў генерал А. Суслапараў, які з'яўляўся савецкім прадстаўніком у стаўцы саюзнікаў. Але паколькі да пачатку працэдуры падпісання ён не атрымаў інструкцыі з Масквы наконт сваіх дзеянняў, то паставіў свой подпіс пад дакументам з агаворкай, што акт не павінен выключаць магчымасць падпісання іншага пагаднення па патрабаванні адной з краін-саюзніц. І інтуіцыя Суслапарава не падвяла – Вярхоўны галоўнакамандуючы І. Сталін катэгарычна адмовіўся прызнаваць падпісаны ў Рэймсе акт капітуляцыі Германіі, паколькі вядучую ролю ў правядзенні гэтай працэдуры адыгрывалі заходнія саюзнікі, і запатрабаваў новай цырымоніі ў вызваленай савецкімі войскамі частцы Берліна, на што пасля некаторых дэбатаў і была атрымана згода.

Месцам для падпісання афіцыйнага акта аб капітуляцыі Германіі быў выбраны некрануты вайной будынак клуба былога сапёрнага вучылішча, у якім на той час размяшчаўся штаб 5-й ударнай арміі (яна ў пачатку мая 1945-га штурмам захапіла берлінскія ўрадавыя кварталы, у тым ліку і будынак імперскай канцылярыі, дзе знаходзілася стаўка Гітлера). Менавіта таму ў цырымоніі падпісання капітуляцыйнага акта ў Карлсхорсце рэй вялі прадстаўнікі савецкага боку.

Ад імя савецкага камандавання акт аб капітуляцыі Германіі падпісаў маршал Г. Жукаў, ад камандавання саюзнікаў – галоўны маршал брытанскіх Ваенна-паветраных сіл А. Тэдэр. У якасці сведак подпісы пад дакументам паставілі амерыканскі генерал К. Спаатс і галоўнакамандуючы французскай арміяй генерал Ж. дэ Латр дэ Тасіны. Ад Германіі акт капітуляцыі падпісалі начальнік штаба вярхоўнага галоўнакамандавання вермахта генерал-фельдмаршал В. Кейтэль, галоўнакамандуючы ваеннамарскімі сіламі адмірал Г. фон Фрыдэнбург і генерал-палкоўнік авіяцыі Г. Штумпф.

Як толькі прадстаўнікі германскага боку паставілі свае подпісы, маршал Жукаў (ён вёў цырымонію) папрасіў іх пакінуць залу, дзе адразу ж пачаліся прыгатаванні да ўрачыстай вячэры. Паводле слоў фрау Інгрыд, дакладна вядома, якія канкрэтна стравы ды напоі і ў якой колькасці выстаўляліся на сталы, колькі разоў мяняўся посуд і інш. Пры гэтым, падкрэслівае яна, такі ж самы стол, толькі без спіртнога, быў накрыты ў асобным пакоі і для нямецкіх генералаў, але тыя катэгарычна адмовіліся ад вячэры.

Наступная экспазіцыя, разгорнутая на другім паверсе будынка музея «Берлін-Карлсхорст», адлюстроўвае два погляды на вайну – савецкі і нямецкі. У размешчаных тут залах з абсалютна чорнымі




▲ Будынак Германа-Расійскага музея «Берлін-Карлсхорст»



▼ Мемарыяльная зала музея – тут 8 мая 1945 года быў падпісаны акт аб безагаворачнай капітуляцыі Германіі

сценамі, якія, паводле расказу нашага экскурсавода, мусяць нагадваць аб «чорных» старонках у гісторыі нямецкага народа, знаходзіцца больш за тысячу экспанатаў, што адлюстроўваюць падзеі ваеннага часу. Тут і дзіцячыя дзённікі з блакаднага Ленінграда, і запісы вязняў канцлагераў, і лісты-трохкутнікі з фронту, і ўспаміны воінаў-вызваліцеляў… А побач – дырэктывы і пастановы нямецкага камандавання аб арганізацыі тых самых канцлагераў, дакладныя запіскі аб ходзе правядзення на акупіраваных тэрыторыях харчовай развёрсткі, зводкі аб пастаўках адтуль у Германію прадуктаў і рабочай сілы…

Фрау Інгрыд падрабязна пра ўсё гэта расказвае і адначасова хоча ведаць нашу думку, запрашае да дыялога. Але яго ў нас не адбываецца, бо яскрава бачна – хто вінаваты, а хто не…

Дарэчы, у музеі «Берлін-Карлсхорст» рэгулярна праводзяцца тэматычныя выставы. Як нам паведамілі, у 2013 годзе тут выстаўлялася экспазіцыя з Беларусі, прысвечаная трагедыі Хатыні. Ужо пасля вяртання дадому я звязаўся з дырэктарам Хатынскага мемарыяла А. Зельскім, і ён распавёў, што немцы праявілі да той выставы вялікую цікавасць. Праўда, як высветлілася, не ўсе з іх, асабліва малодшае пакаленне, ведалі, што такое Хатынь, дзе яна знаходзіцца і якая трагедыя разыгралася там 22 сакавіка 1943 года. Але выстава зрабіла сваю справу – пакідалі яе наведвальнікі ў журбе і з цвёрдым перакананнем, што трагедыя Хатыні і яшчэ больш як 5 тыс. знішчаных фашыстамі беларускіх вёсак, многія з якіх былі спалены разам са сваімі жыхарамі, ніколі не павінна паўтарыцца.

…Назад мы вярталіся па тым жа маршруце. І зноў нас прывітала сваёй гаманой грамада школьнікаў. Толькі на гэты раз ад'язджалі мы, а яны спяшаліся на сустрэчу з гісторыяй.

▼ Астаткі казематаў гестапа – сёння гэта частка экспазіцыі інфармацыйна-выставачнага цэнтра «Тапаграфія тэрору»



## Тэрыторыя смутку

Прасторны, узведзены ў выглядзе агромністага шклянога прамавугольніка, будынак інфармацыйна-выставачнага цэнтра «Тапаграфія тэрору» прыкметна вылучаецца сярод іншых музейных аб'ектаў Берліна не толькі сваёй формай, але і зместам. Размешчаная ў яго сценах экспазіцыя прысвечана не ахвярам Другой сусветнай вайны, а іх ка́там – ваенным злачынцам, якія глуміліся на мірнымі жыхарамі, чынілі тэрор, планавалі і ажыццяўлялі масавыя забойствы людзей.

Калі наш экскурсавод Себасцьян Герхард, паляк па паходжанні, паведаміў пра гэта, на тварах многіх з нас адбілася сумненне: «А ці не зашмат гонару для нацыстаў?» Відаць, запрыкмеціўшы гэта, ці, магчыма, ужо ведаючы на вопыце сваіх папярэдніх экскурсій, што менавіта такім пытаннем задаецца большасць наведвальнікаў цэнтра, гід паспяшаўся з тлумачэннем: «Мы зусім не ідэалізуем ваенных злачынцаў. Экспазіцыя нашага музея заклікана раскрыць сутнасць фашызму праз погляды яго ідэолагаў і тэарэтыкаў, а таксама непасрэдных выканаўцаў іх ганебных ідэй…»

Месца, дзе размяшчаецца цэнтр «Тапаграфія тэрору», з'яўлялася для Берліна знакавым на працягу многіх гістарычных перыядаў. Як расказвае далей С. Герхард, у 1737–1739 гадах тут прускім баронам Вернезобрам быў пабудаваны палац для размяшчэння ў ім гарадской рэзідэнцыі. Узвядзенню будынка папярэднічала даволі пікантная гісторыя: кароль Фрыдрых Вільгельм I сасватаў свайму любімцу генералу Крывіну фон Форкадэ дачку заможнага купца Вернезобра, але высокапастаўлены жаніх атрымаў ад варот паварот. І ўсё ж, нягледзячы на катэгарычную адмову дзяўчыны, кароль настойваў на сваім, патрабаваў вяселля. Барон Вернезобр, відаць, вельмі моцна любіў сваю дачку, бо ўступіў з Вільгельмам I

у перамовы і вытаргаваў цалкам прымальны для сябе кампраміс – вяселля не будзе, але ён за свае сродкі мусіць пабудаваць палац для гарадской рэзідэнцыі. У далейшым будынак неаднойчы мяняў гаспадароў і ўвайшоў у гісторыю як маёмасць аднаго з іх – прынца Альбрэхта Прускага. У 1920-х – пачатку 1930-х гадоў урад тагачаснай Германіі – Веймарскай рэспублікі – арандаваў яго для размяшчэння высокіх дзяржаўных гасцей. Пасля прыходу да ўлады нацыянал-сацыялістаў на чале з А. Гітлерам у палацы прынца Альбрэхта размясціліся гестапа – тайная дзяржаўная паліцыя і турма гэтага ведамства. У 1939 годзе тут таксама прапісаліся штаб-кватэры імперскай службы бяспекі, службы бяспекі рэйхсфюрара СС і службы бяспекі СС-СД – такое вось кодла, што выпрацоўвала і ўдасканальвала тактыку тэрору, прычым не толькі на тэрыторыі Германіі.

– Нацысты невыпадкова выбралі менавіта гэты прыгожы будынак у цэнтры Берліна, а не якую-небудзь казарму на ўскраіне горада, – сцвярджае С. Герхард. – Жах тэрору павінен быў знаходзіцца навідавоку і служыць недвухсэнсоўнай перасцярогай для нязгодных з нацысцкай палітыкай і ўсіх іншадумцаў…

І ўсё ж у кастрычніку 1944 года ў час аднаго з авіяналётаў саюзнікаў на Берлін гэтае фашысцкае логава было пашкоджана, а яшчэ праз 5 гадоў сенат Берліна прыняў рашэнне аб зносе руін палаца прынца Альбрэхта, нягледзячы на тое, што суседнія з ім будынкі, якія, як і ён, мелі культурна-гістарычнае значэнне, падлягалі аднаўленню. Аднак пасля таго, як руіны зраўнавалі з зямлёй, на вызваленым месцы штосьці новае ўзводзіць не сталі – пэўны час яно пуставала, а потым там размясціўся аўтадром. У сярэдзіне 1980-х гадоў, на хвалі распачатай у Савецкім Саюзе перабудовы, водгаласы якой дакаціліся і да ГДР, грамадская ініцыятыва берлінцаў дабілася дазволу ад гарадскога муніцыпалітэта на правядзенне раскопак, у выніку якіх знайшлі падвалы гестапаўскай турмы. Пасля гэтага было ініцыявана стварэнне выставачнай экспазіцыі аб зладзействах нацыстаў – яна з'явілася ў 1987 годзе на стэндах пад адкрытым небам. Праз год-два самі ж берлінцы прапанавалі пабудаваць пад яе спецыяльнае памяшканне. Але задуманае ажыццяўлялася доўга – інфармацыйна-выставачны цэнтр «Тапаграфія тэрору» быў адкрыты толькі ў 2010 годзе.




▲ Эмацыянальны расказ пра зверствы фашызму супрацоўніка цэнтра «Тапаграфія тэрору» Себасцьяна Герхарда

Сама па сабе тэрыторыя вакол цэнтра выглядае някідка: там няма ні дрэў, ні травінкі – усюды, куды ні кінь позірк, шчэбень. Гэта, як кажуць, сімвалічна – не можа існаваць жыццё там, дзе ўладарыла смерць. З аднаго боку замест агароджы – фрагмент Берлінскай сцены, без звыклых, як у іншых месцах, графіці, з шэрай, нявоўнай паверхняй. Уздоўж яе – раскоп у выглядзе шырокага рова. А ў ім прыкрытыя шкляным дахам рэшткі цаглянага муру, стары падмурак з квадратнымі нішамі, часам выкладзенымі жаўтлявай пліткай, там-сям са сцен тырчаць абрэзкі іржавых труб… Гэта ўсё, што засталося ад падвалаў гестапа.

Каб мы маглі больш яскрава адчуць, што адбывалася ў гэтых казематах, экскурсавод С. Герхард запрашае нас у сярэдзіну будынка. А там, насуперак чаканням, усё надзвычай стандартна. Экспазіцыя інфармацыйна-выставачнага цэнтра «Тапаграфія тэрору» ўладкавана проста – па прынцыпе разгорнутай кнігі. У агромністай, плошчай 800 квадратных метраў, зале такіх «кніг» змясцілася некалькі дзясяткаў, на «старонках»-стэндах кожнай з іх змешчаны павялічаныя копіі фотаздымкаў 1930-х – першай паловы 1940-х гадоў, тлумачальныя тэксты, карты і схемы, на нешматлікіх сталах – факсіміле дакументаў: загады, справаздачы, цыркуляры, дырэктывы, побач – некалькі маніtoраў з хранікальным відэа. Тэматычна экспазіцыя аб'яднана ў пяць асноўных раздзелаў: нацысцкі захоп улады; установы тэрору (СС і паліцыя); тэрор, пераслед іншадумцаў і

халакост у Рэйху; дзейнасць службаў СС і галоўнага ўпраўлення імперскай бяспекі на акупіраваных фашыстамі тэрыторыях; расплата, што спасцігла злачынцаў ужо ў пасляваенны перыяд.

Пан Себасцьян падоўгу спыняецца каля асобных фотаздымкаў, эмацыянальна расказвае пра іх драматычныя, напрыклад, расстрэлы палонных, сюжэты, запрашае пранікнуцца і падумаць пра адчуванні тых далёкіх і незнаёмых нам людзей. Прычым спачатку ахвяр, затым іх катаў, а пасля ўжо, асобна, фатографа, які здымаў працэс забойства… У кожнага з нашай групы, вядома, былі свае пачуцці, але зусім не абыякавыя, а шчырыя, пранікнёныя і спачувальныя… Я добра памятаю, што мне чамусьці тады падумалася пра вогненны жах і пякучы нясцерпны боль жыхароў нашай Хатыні…

Тое, пра што расказвае экскурсавод далей, проста не ўкладваецца ў галаве: планаванне пагромаў, распрацоўка тактыкі выпаленай зямлі на ўсходзе, у тым ліку і нашай беларускай зямлі, карныя аперацыі супраць партызан, канцэнтрацыйныя лагеры і паўсюдныя жах, кроў, смерць… Але ўсё гэта было. І пацвярджаецца яно не столькі дакументамі, колькі незагойным болем цудам уцалелых ахвяр фашызму і нашай незабыўнай памяццю.

Гледзячы на змешчаныя фота шматлікіх катаў і забойцаў, міжволі задаешся пытаннем: ці маглі яны гэтага не рабіць, ці быў у гэтых людзей выбар? Аказваецца, быў.

– У 1941 годзе ў Беластоку нямецкім салдатам загадалі расстраляць некалькі мужчын-яўрэяў, – расказвае пра факт са свайго гістарычнага даследавання С. Герхард. – Для таго батальёна гэта было ўпершыню, і адзін з немцаў адмовіўся выконваць загад. Што з ім зрабілі? Нічога. Ён спакойна даслужыў да канца вайны. Нават сам Г. Гімлер сцвярджаў, што адмовіцца ў такой сітуацыі – не палітычнае злачынства. Злачынства – дапамагаць ахвярам, падбухторваць іншага не выконваць загады. Адмовіцца ж расстрэльваць няўзброеных мірных жыхароў – не баязлівасць, бо ніякай рызыкі для жыцця тут не існуе. І пра гэта ведаў кожны салдат вермахта…

Тады чаму стралялі?.. Няўжо справа ва ўсеагульным адурманьванні ідэямі перавагі сваёй нацыі над другой, у чалавеканенавісніцтве, у празе прынізіць, падпарадкаваць сабе іншага?.. Але адкуль і па якой прычыне ў людзях праяўляюцца такія жывёльныя інстынкты і чаму яны іх палоняць?..

– Нямецкім салдатам і паліцэйскім дазвалялася рабіць асабістыя фотаздымкі падчас вайны, – спрабуе адказаць на некаторыя нашы пытанні Себасцьян Герхард. – Але былі загады, што канкрэтна нельга здымаць. Многія лічылі расстрэлы мірнага насельніцтва нечым выдатным і хацелі паказаць гэта іншым. Пасылалі здымкі дадому. Яны думалі, што забіваць няўзброеных людзей – геройства. Калі яны гэтым ганарыліся, то гэта ўжо справа іх асобаснай псіхікі…

Прызнацца, такі адказ не зусім задаволіў. Але, калі шчыра, дабівацца нечага больш канкрэтнага не было жадання: пасля трохгадзіннага знаходжання на тэрыторыі, ахутанай атмасферай трагічнага смутку, нястрымна захацелася ўдыхнуць свежага паветра.



Спіс ахвяр Карэліцкага гета ў музейнай экспазіцыі Мемарыяла памяці забітых яўрэяў Еўропы

## Бессэнсоўная нелагічнасць

Ніякай логікі. Гэта першае, што прыходзіць у галаву пры беглым знаёмстве з берлінскім Мемарыялам памяці забітых яўрэяў Еўропы: вялізная, амаль 5-гектарная плошча ў цэнтры горада без канкрэтна вызначаных межаў і без інфармацыйных таблічак проста ўкрыта шэрымі бетоннымі блокамі рознай вышыні. Іх на мемарыяле, як падлічана, праўда, не намі, – 2711. Тут пануе поўная свабода – хтосьці спяшаецца па справах і зразае шлях праз лабірынт бетон-





◀ У адной з залаў Мемарыяла памяці забітых яўрэяў Еўропы

▲ Той самы «бессэнсоўна-нелагічны» мемарыял

ных саркафагаў, а хтосьці спыніцца і, крыху паразважаўшы, зацікавіцца незвычайнасцю ўбачанага ды паспрабуе разабрацца, што тут і да чаго. І такіх ахвотнікаў унікнуць у сутнасць помніка, як сведчыць афіцыйная статыстыка, за год тут бывае больш за мільён.

– Сапраўды, цяжка знайсці якую-небудзь логіку ў архітэктуры гэтага мемарыяла, – пагаджаецца наш гід нямецкі гісторык, яшчэ зусім нядаўна жыхар Украіны, Дзмітрый Шаўчэнка. – Але гэта толькі на першы погляд. Назва помніка – Мемарыял памяці забітых яўрэяў Еўропы. А ці ёсць логіка ў забойстве не вінаватых ні ў чым бяззбройных мужчын, жанчын, дзяцей?.. Так і тут: лабірынты з бетонных блокаў сімвалізуюць канцэпцыю помніка. А яна, паводле задумы яго аўтара амерыканскага архітэктара-дэканструктывіста Пітэра Айзенмана, якраз і заключаецца ў бессэнсоўнасці ўчыненага. У дадзеным выпадку ўчыненага фашыстамі – за час Халакосту ў Еўропе загінула звыш 6 мільёнаў яўрэяў.

Аднак, як расказвае далей Дзмітрый, калі глядзіш на мемарыял з вышыні, то здаецца, гэта ўзбунтавалася зямля і пачала падымацца. Яшчэ крыху – і трэсне асфальт. Такі эфект утвараецца ад таго, што ўсе блокі тут рознай вышыні – ад 50 сантыметраў да 5 метраў. Невысокія па краях мемарыяла, яны «растуць» бліжэй да яго цэнтра. Трапіўшы ў іх лабірынт, спачатку губляешся – бетонныя глыбы становяцца ўсё вышэйшыя і вышэйшыя, а неба і шум гарадскіх вуліц – усё далей і далей. Час ад часу з'яўляюцца і знікаюць фігуркі такіх жа цікаўных, як і ты. Ад гэтага нарастае пачуццё трывогі і бессэнсоўнасці хаджэння па шматлікіх калідорах.

Калі ж нарэшце ты выбіраешся з гэтай нелагічнасці і на поўныя грудзі ўдыхаеш прастор бліжэйшай вуліцы, з'яўляецца заканамернае пытанне: а што далей? А далей ногі ўжо самі вядуць да ўвахода ў размешчанае пад мемарыялам сутарэнне. Яно тут прасторнае, з туалетамі, латкамі і нават з гардэробам, а яшчэ – з газетна-кніжнымі кіёскамі, напоўненымі разнамоўнымі інфармацыйнымі буклетамі. Аднак цэнтральнае месца ў падзямельнай прасторы займаюць чатыры тэматычныя залы. Іх экспазіцыі расказваюць пра Халакост – адна пра яго маштабы, другая пра трагедыі канкрэтных сем'яў, у трэцяй пазначаны імёны вядомых ахвяр, у чацвёртай – гісторыя 220 месц на тэрыторыі Еўропы, дзе чынілася непапраўнае.

Ёсць у экспазіцыйнай частцы мемарыяла і беларуская старонка. Тут можна даведацца пра знішчэнне Мінскага гета, пра тое, як каталі людзей у лагеры смерці ў Трасцянцы, а яшчэ – пра масавыя расстрэлы яўрэяў у Бабруйску, Пінску, Слуцку, Карэлічах… Тут жа на фотаздымках – і трагедыя яўрэйскай сям'і Коганаў з Навагрудка…

– Экспазіцыя мемарыяла, – расказвае нам Д. Шаўчэнка, – зроблена такім чынам, што кожны наведвальнік міжволі праецыруе ўсеагульную трагедыю на сябе, на сваю сям'ю. Менавіта тады ўбачаны на фотаздымках боль становіцца бліжэйшым і зразумелым…

Не пагадзіцца з такім меркаваннем нельга. Са змрочным настроем і ўсведамленнем бессэнсоўнай нелагічнасці тых нягод і тра-




▲ Латунныя таблічкі, устаноўленыя ў памяць пра канкрэтнага чалавека, які на тым месцы загінуў ад рук фашыстаў, даволі часта сустракаюцца на берлінскіх тратуарах



▲ Гэтая таблічка – неад'емная частка экспазіцыйнай прасторы Баварскага квартала

гедый, што прыносяць нам войны, мы пакідалі берлінскі Мемарыял памяці забітых яўрэяў Еўропы.

## Гісторыя пад нагамі

У сталіцы Германіі і сёння, праз 70 гадоў, якія аддзяляюць нас ад падзей Другой сусветнай вайны, сведчанні пра тагачасныя падзеі можна сустрэць літаральна на кожным кроку. Прычым, у самым прамым сэнсе, памяць пра гераізм змагароў з нацыянал-сацыялізмам, пра канкрэтнага чалавека, чыё жыццё было абарвана вайной, пра памятную дату зафіксавана пад нагамі, на тратуары. Невялічкія латунныя таблічкі з адпаведным тэкстам ці прозвішчамі людзей умураваны ў брусчатку акурат на месцы, дзе адбылася тая ці іншая падзея. Для берлінцаў такая форма захавання памяці – справа звыклая, як і тое, што кожны год у самых розных месцах германскай сталіцы з'яўляюцца новыя і новыя таблічкі. Як нам расказалі, іх устаноўку ініцыююць пераважна даследчыкі – аматары мінуўшчыны канкрэтнай вуліцы, двара, квартала. І практычна заўсёды іх рупнасць падтрымліваюць улады, як і спонсары, якія ахвяруюць сродкі на выраб і ўстаноўку такіх памятных «плітак».

Не менш нас зацікавіў і яшчэ адзін прыклад грамадскай ініцыятывы жыхароў Берліна. Гэта – Баварскі квартал, так званая памятная прастора ў раёне станцыі метро «Баварская плошча», дзе нагляднa расказваецца, як дзейнічалі ў рэйху антыяўрэйскія законы.

– Ідэя расказаць пра прыніжэнне яўрэяў у фашысцкай Германіі з'явілася ў пачатку 1990-х гадоў, – гаворыць жыхарка квартала і адзін з натхняльнікаў ініцыятывы Габрыэла Рэстле. – Толькі паглыбіўшыся ў гэтую тэму, мы ўсвядомілі, наколькі ўсё гэта было жахліва, і разам з мастакамі стварылі серыю з 80 навясных металічных знакаў. Устанавілі іх у бачных месцах па ўсім квартале такім чынам, каб чалавек, які звярнуў увагу на адзін з іх, мог з лёгкасцю ўбачыць другі і распачаць такім чынам невялікую экскурсію…

Члены нашай групы таксама адважыліся на такі экскурсійны агляд, і, ведаеце, зацікавіла. Кожная такая таблічка з аднаго боку змяшчае выяву канкрэтнай рэчы. Напрыклад, гадзіннік. Ты задаешся пытаннем: чаму менавіта ён? Заглядваеш на адваротны бок і чытаеш вытрымку з прынятага нямецкімі нацыянал-сацыялістамі закона ад 1 верасня 1933 года, які забараняў яўрэям выходзіць з памяшкання пасля 20 гадзін зімой і 21 гадзіны летам.

А яшчэ тамтэйшая грамада адкрыла кавярню, дзе за кубкам кавы таксама можна даведацца пра гісторыю Баварскага квартала, паглядзець фільмы пра даваенны генацыд яўрэяў у Германіі. Зразумела, і пра Халакост.

Аб тым, як захоўваюць памяць пра ваенны час у Берліне, можна расказваць амаль бясконца. І кожны раз знаходзіць арыгінальныя прыклады падачы цікавай і патрэбнай інфармацыі. Наколькі падобны вопыт мог бы прыжыцца ў нас? Упэўнены, мог бы. Усё залежыць ад ініцыятывы.

Чаму б у нас у Мінску ці якім іншым беларускім горадзе, зайшоўшы, скажам, у рэстаран ці кавярню, у чаканні свайго заказу не пачытаць, як гэта ёсць у Берліне, пра гісторыю будынка, дзе размяшчаецца ўстанова грамадскага харчавання? Чаму б на сталічнай плошчы Якуба Коласа, напрыклад, не ўстанавіць тумбу з фотаздымкамі і адпаведным тэкстам пра гераізм экіпажа савецкага танка Т-28, які раніцай 3 ліпеня 1941 года ўварваўся ў акупіраваны немцамі Мінск і ў раёне былой Камароўкі вёў няроўны бой з ворагам? Ці замест абязлічаных традыцыйных вывесак-зорачак з надпісам «Тут жыве ветэран Вялікай Айчыннай вайны», што яшчэ сустракаюцца пераважна на вясковых дамах, устанавіць больш інфармацыйна насычаныя шыльды – з пералікам баявога шляху ветэрана, гарадоў, якія ён вызваляў, і г.д. Тады, думаецца, з куды большай увагай і павагай кожны з нас праходзіў бы каля дома, напрыклад, майго школьнага настаўніка Сямёна Мікалаевіча Стомы з вёскі Стары Свержань Стаўбцоўскага раёна, калі б на будынку прачытаў: яго ўладальнік – былы партызанскі сувязны, затым сяржант 753-га палка 192-й дывізіі 3-га Беларускага фронту прымаў удзел у вызваленні Літвы і Усходняй Прусіі, дзе і быў паранены, а пасля, вярнуўшыся са шпіталя на родную Стаўбцоўшчыну, амаль 40 гадоў сеяў разумнае, добрае, вечнае ва ўстановах адукацыі наднёманскага рэгіёна.

**Сяргей ГАЛОЎКА**
**Мінск – Берлін**
**Фота аўтара**